МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ»

Кафедра замежных моў

Репозиторий ГомГМУ

**Т. А. КАРНІЕЎСКАЯ**

# ЗБОРНІК ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**Вучэбна-метадычны дапаможнік**
**для студэнтаў 1 курса лячэбнага і медыка-дыягнастычнага факультэтаў**
**установ вышэйшай медыцынскай адукацыі**

Гомель
2019

УДК 811.161.3(072)(076.1)
ББК 81.411.3я73
К 24

**Рэцэнзенты:**
доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай мовы
Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны
***А. А. Станкевіч;***
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры славянскіх і рамана-германскіх моў
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту
***А. У. Ярмоленка***

**Карніеўская, Т. А.**
К 24 Зборнік тэставых заданняў па беларускай мове: вучэб.-метад. дапаможнік для студэнтаў 1 курса лячэбнага і медыка-дыягнастычнага факультэтаў установ вышэйшай медыцынскай адукацыі / Т. А. Карніеўская. — Гомель: установа адукацыі “Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”, 2019. — 52 с.
ISBN 978-985-588-108-8

У вучэбна-метадычным дапаможніку змешчаны тэставыя заданні па асноўных раздзелах курса “Беларуская мова: прафесійная лексіка”, пры гэтым акцэнт робіцца як на пашырэнні і замацаванні ведаў па асноўных пытаннях славянскай лінгвістыкі, так і на сістэматызацыі прынцыпаў перадачы медыцынскай лексікі на беларускую мову. Асаблівая ўвага надаецца правапісу запазычаных слоў і асаблівасцям тэрміналагічнай лексікі.

Прызначаны для студэнтаў 1 курса лячэбнага і медыка-дыягнастычнага факультэтаў установ вышэйшай медыцынскай адукацыі.

Зацверджаны і рэкамендаваны да выдання навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» 20 чэрвеня 2018 г., пратакол № 4.

**УДК 811.161.3(072)(076.1)**
**ББК 81.411.3я73**

**ISBN 978-985-588-108-8**

© Установа адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны
медыцынскі ўніверсітэт», 2019



Репозиторий ГомГМУ

# ЗМЕСТ

*Уводзіны* ........ 4
**Тэма 1.** Агульныя пытанні мовазнаўства ........ 5
Тэст 1 ........ 5
Тэст 2 ........ 5
**Тэма 2.** Арфаграфічныя нормы беларускай мовы ........ 10
Тэст 1 ........ 15
Тэст 2 ........ 21
**Тэма 3.** Медыцынская тэрміналогія беларускай мовы ........ 27
Тэст 1 ........ 27
Тэст 2 ........ 32
**Тэма 4.** Выніковыя тэсты ........ 37
Тэст 1 ........ 37
Тэст 2 ........ 42
*Адказы на тэставыя заданні* ........ 47
*Літаратура* ........ 50

Репозиторий ГомГМУ

# УВОДЗІНЫ

Сучасная адукацыйная прастора патрабуе ад будучых спецыялістаў любой галіны чалавечай дзейнасці хуткасці і дакладнасці выбару рашэння ў сітуацыі з некалькімі варыянтамі выхаду. Таму ў педагогіцы вельмі папулярным відам работы з навучэнцамі і студэнтамі ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах становяцца тэсты. Яркае таму сведчанне — існаванне на працягу ўжо некалькіх гадоў прынятай на дзяржаўным узроўні такой формы адбору абітурыентаў у ВНУ Рэспублікі Беларусь, як цэнтралізаванае тэсціраванне.

Вышэйшая школа Рэспублікі Беларусь выкарыстоўвае тэсціраванне як адну з найноўшых эфектыўных формаў праверкі і самаправеркі ведаў студэнтаў па многіх дысцыплінах. Дадзены вучэбна-метадычны дапаможнік змяшчае матэрыял для праверкі ведаў па курсе "Беларуская мова: прафесійная лексіка" і прызначаны для выкарыстання на практычных занятках на першым курсе лячэбнага і медыка-дыягнастычнага факультэтаў устаноў вышэйшай медыцынскай адукацыі. Тэставыя заданні абапіраюцца ў першую чаргу на лінгвістычныя веды, атрыманыя студэнтамі на папярэдняй ступені адукацыі, а матэрыял другога і асабліва трэцяга раздзелаў улічвае спецыфіку менавіта медыцынскай прафесійнай адукацыі.

Для паспяховай работы з тэстамі прапанаванага дапаможніка патрэбна дакладнае засваенне матэрыялу азначанага курса, а таксама выкарыстанне слоўнікаў і даведнікаў па сучаснай беларускай мове.

Рэпазіторый ГомДМУ

# ТЭМА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ МОВАЗНАЎСТВА

***Выберацe адзін правільны адказ***

## *Тэст 1*

***1. Мова — гэта …***

*Варыянты адказу:*

а) сукупнасць адзінак (гукаў, слоў, сказаў і інш.) і правіл іх ужывання;

б) выкарыстанне моўных адзінак у працэсе зносін;

в) правільны выбар слова і дарэчнасць яго прымянення;

г) працэс зносін паміж людзьмі;

д) сукупнасць мясцовых гаворак.

***2. Адзначце, у якую падгрупу славянскіх моў уваходзіць беларуская мова?***

*Варыянты адказу:*

а) заходнеславянскую;

б) усходнеславянскую;

в) паўднёваславянскую;

г) паўночнаславянскую;

д) цэнтральную.

***3. Адзначце мовы, якія лічацца заходнеславянскімі.***

*Варыянты адказу:*

а) польская, чэшская, украінская;

б) польская, балгарская, украінская;

в) польская, чэшская, славацкая;

г) польская, чэшская, македонская;

д) польская, балгарская, македонская.

***4. Адзначце, якая з наступных славянскіх моў на сучасным этапе развіцця выкарыстоўвае лацінскі алфавіт.***

*Варыянты адказу:*

а) польская

б) балгарская

в) руская

г) украінская

д) беларуская

***5. Генеалагічная класіфікацыя прадугледжвае падзел моў на групы паводле:***

*Варыянты адказу*:

а) тэрыторыі распаўсюджвання;

б) колькасці носьбітаў;

Репозиторий ГомГМУ

в) часу з'яўлення;
г) паходжання;
д) алфавіта.

***6. Арфаэпічныя нормы патрабуюць …***
*Варыянты адказу:*
а) правільнага напісання слоў;
б) правільнага ўжывання формаў слова;
в) правільнай пабудовы словазлучэнняў і сказаў;
г) правільнага вымаўлення;
д) правільнай пастаноўкі знакаў прыпынкую.

***7. Нормы, якія патрабуюць правільнага выбару слова і дарэчнасці яго прымянення, называюцца…***
*Варыянты адказу:*
а) арфаграфічныя;
б) лексічныя;
в) сінтаксічныя;
г) марфалагічныя;
д) словаўтваральныя.

***8. Адзначце сказ, у якім парушаны пунктуацыйныя нормы:***
*Варыянты адказу:*
а) Абсыпаныя халодным срэбрам інею, заблішчалі ў сонечных промнях дрэвы.
б) Працуй, вучыся, дружа мой, і ведай: немагчымага няма.
в) Стары лес, што стаяў за рэчкай пазіраў важна і лагодна.
г) Даўно язмін з чаромхай адцвілі, адгаманілі белым цветам.
д) Стрэньма, браткі, новую вясну!

***9. Адзначце радок, у якім парушаны акцэнталагічныя нормы:***
*Варыянты адказу:*
а) ло́пух, нафтаправо́д, баро́даўка, некрало́г, спідо́метр;
б) но́здра, до́лар, электрапро́вад, аглóбля, бало́цісты;
в) пуцеправо́д, гастрано́мія, фее́рыя, ге́незіс, асіме́трыя;
г) кіламе́тр, экспе́рт, бюракра́тыя, пуло́вер, міліметро́вы;
д) прэміро́ваны, фенаме́н, тво́раг, ката́лаг, дагма́т.

***10. Адзначце, колькі ў беларускай мове часцін мовы:***
*Варыянты адказу:*
а) шэсць;
б) сем;
в) восем;

Репозиторий ГомГМУ

г) дзевяць;
д) дзесяць.

***11. Выберыце радок з самастойнымі часцінамі мовы:***
*Варыянты адказу:*
а) назоўнік, прыметнік, злучнік;
б) дзеяслоў, лічэбнік, займеннік;
в) назоўнік, лічэбнік, часціца;
г) дзеяслоў, прыназоўнік, выклічнік;
д) назоўнік, прыслоўе, выклічнік.

***12. Знайдзіце нязменную часціну мовы:***
*Варыянты адказу:*
а) прыметнік;
б) дзеяслоў;
в) лічэбнік;
г) прыслоўе;
д) назоўнік.

***13. Словы, падобныя па гучанні, але розныя па значэнні:***
*Варыянты адказу:*
а) паронімы;
б) сінонімы;
в) антонімы;
г) мнагазначныя;
д) амонімы.

***14. Антонімы — гэта …***
*Варыянты адказу:*
а) словы, блізкія па значэнні;
б) словы, аднолькавыя па напісанні, але розныя па значэнні;
в) словы з супрацьлеглым значэннем;
г) словы, блізкія па напісанні, але розныя па значэнні;
д) словы, якія маюць некалькі значэнняў.

***15. Выберыце сярод прыведзеных слоў амонім:***
*Варыянты адказу:*
а) *парэнхіма* — ‘асноўная тканка якога-небудзь органа’ і ‘раслінная тканка, якая складаецца з клетак аднолькавага памеру’;
б) *дэпрэсія* — ‘хваравіта прыгнечаны псіхічны стан’ і ‘заняпад, застой у гаспадарчым, грамадскім жыцці’;
в) *паталогія* — ‘навука аб хваробных працэсах, адхіленнях ад нормы ў арганізме’ і ‘хваравітае адхіленне ад нормы’;

Репозиторий ГомГМУ

г) *ёд* — ‘хімічны элемент з групы галагенаў, рэчыва ў выглядзе цёмна-шэрых крышталёў, якое здабываецца галоўным чынам з марскіх водарасцяў; выкарыстоўваецца ў медыцыне, фатаграфіі, тэхніцы’ і ‘спіртавы раствор гэтага рэчыва, прызначаны для медыцынскіх мэт’;

д) *сакрэт* — ‘тайна, тое, пра што не гавораць’ і ‘рэчыва, якое выпрацоўваецца клеткамі розных залоз, неабходнае для жыццёвых функцый арганізма’.

***16. Стыль, які рэалізуецца ў дакладах, манаграфіях, рэфератах:***

*Варыянты адказу:*

а) гутарковы;
б) публіцыстычны;
в) навуковы;
г) афіцыйна-дзелавы;
д) мастацкі.

***17. Адзначце, што з пералічанага характэрна для афіцыйна-дзелавога стылю:***

*Варыянты адказу:*

а) тэрміналогія;
б) ацэначная лексіка;
в) заклікі;
г) рытарычныя пытанні;
д) канцылярскія штампы.

***18. Адзначце, сферай ужывання якога стылю з’яўляецца грамадска-палітычная:***

*Варыянты адказу:*

а) гутарковы;
б) публіцыстычны;
в) навуковы;
г) афіцыйна-дзелавы;
д) мастацкі.

***19. Сукупнасць прыёмаў адбору і выкарыстання моўных сродкаў у залежнасці ад характару і зместу выказвання — гэта …***

*Варыянты адказу*:

а) лексікалогія;
б) стыль;
в) маўленне;
г) тэрміналогія;
д) тэкст.



Репозиторий ГомГМУ

***20. Лексіка — гэта …***

*Варыянты адказу*:

а) слоўнікавы склад мовы, сукупнасць значымых слоў;

б) раздзел мовазнаўства, які вывучае слоўнікавы склад мовы;

в) розныя словы для абазначэння аднаго і таго ж паняцця;

г) выкарыстанне моўных сродкаў у залежнасці ад характару і зместу выказвання;

д) правільны выбар слова і дарэчнасць яго прымянення.

***21. Адзначце, якая з наступных асаблівасцей не з'яўляецца характэрнай для тэрміна:***

*Варыянты адказу:*

а) дакладнасць;

б) мастацкая выразнасць;

в) адсутнасць экспрэсіўнасці;

г) адсутнасць эмацыянальнасці;

д) сістэмнасць.

***22. Адзначце слова, пры вымаўленні якога дапушчана памылка:***

*Варыянты адказу:*

а) [л’іджба];

б) [св’эчка];

в) [стушка];

г) [с’п’эў];

д) [з’в’ін’іц’].

***23. Адзначце словазлучэнне, у якім дапушчана памылка ў дапасаванні прыметніка да назоўніка:***

*Варыянты адказу:*

а) злы сабака;

б) разборлівы подпіс;

в) гуллівае птушаня;

г) бяскрайні стэп;

д) маленькі шчаня.

***24. Адзначце тлумачэнне, якое адпавядае фразеалагізму*** *бібікі біць:*

*Варыянты адказу:*

а) кланяцца каму-небудзь;

б) марнаваць час, гультаяваць;

в) быць уважлівым;

г) перамагчы каго-небудзь;

д) рабіць вельмі хутка.

Репозиторий ГомГМУ

***25. Адзначце, у якім слоўніку змешчана інфармацыя пра паходжанне таго ці іншага слова:***

*Варыянты адказу:*

а) этымалагічны;

б) фразеалагічны;

в) арфаграфічны;

г) перакладны;

д) марфемны.

## *Тэст 2*

***1. Маўленне — гэта …***

*Варыянты адказу:*

а) выкарыстанне моўных адзінак у працэсе зносін;

б) сукупнасць адзінак (гукаў, слоў, сказаў і інш.) і правіл іх ужывання;

в) пісьмовая форма мовы;

г) тэрытарыяльна абмежаваная разнавіднасць мовы;

д) мова аднаго ці некалькіх населеных пунктаў, якая мае спецыфічныя рысы.

***2. Адзначце, у якую падгрупу славянскіх моў уваходзіць украінская мова:***

*Варыянты адказу:*

а) заходнеславянскую;

б) усходнеславянскую;

в) паўднёваславянскую;

г) паўночнаславянскую;

д) цэнтральную.

***3. Адзначце мовы, якія лічацца паўднёваславянскімі***:

*Варыянты адказ:*

а) польская, чэшская, славацкая;

б) балгарская, сербахарвацкая, украінская;

в) балгарская, сербахарвацкая, македонская;

г) балгарская, чэшская, македонская;

д) польская, македонская, славацкая.

***4.Адзначце, якая з наступных славянскіх моў на сучасным этапе развіцця выкарыстоўвае кірыліцу:***

*Варыянты адказу:*

а) чэшская;

б) балгарская;

в) польская;

г) славацкая;

д) такой мовы няма.



Репозиторий ГомГМУ

***5. Паводле генеалагічнай класіфікацыі мовы свету аб’ядноўваюцца ў:***
*Варыянты адказу:*
а) класы;
б) зямляцтвы;
в) блокі;
г) аб’яднанні;
д) сем’і.

***6. Сінтаксічныя нормы патрабуюць:***
*Варыянты адказу:*
а) правільнага напісання слоў;
б) правільнага ўжывання формаў слова;
в) правільнага вымаўлення;
г) правільнай пабудовы словазлучэнняў і сказаў;
д) правільнай пастаноўкі знакаў прыпынку.

***7. Нормы, якія патрабуюць правільнага напісання слоў, называюцца:***
*Варыянты адказу:*
а) арфаэпічныя;
б) акцэнталагічныя;
в) арфаграфічныя;
г) пунктуцыйныя;
д) лексічныя.

***8. Адзначце радок, у якім ва ўсіх словах захаваны акцэнталагічныя нормы:***
*Варыянты адказу:*
а) стэнагра́фія, хао́с, жалюзі́, кета́, ква́ртал;
б) флюараграфі́я, во́льха, трубаправо́д, трохразо́вы, дакуме́нт;
в) спіна́, апака́ліпсіс, крапіва́, о́птавы, асно́ўны;
г) газаправо́д, во́сьмая, не́катары, выпа́дак, украі́нец;
д) дагаво́р, ка́мбала, во́кунь, і́мя, каме́нны.

***9. Адзначце сказ, у якім парушаны пунктуацыйныя нормы:***
*Варыянты адказу:*
а) Маюцца шматлікія падставы для таго, каб назваць XV–XVI ст. «залатым векам» беларускай культуры, мовы, літаратуры.
б) Вы ўбачыце ўсе канцы нашай мілай, ласкавай, няяркай краіны, якая, аднак, зачаруе вас сваёй няўлоўнай прыгажосцю.
в) Калі б мне хоць жменьку сонца, я б сыпнуў туды, дзе цёмна.
г) Хадзем, дружа, паспытаем смакаты.
д) Ох, паплыў бы я, здаецца, хмаркі разам з вамі.



Репозиторий ГомГМУ

***10. Адзначце, колькі ў беларускай мове самастойных часцін мовы:***
*Варыянты адказу:*
а) пяць;
б) шэсць;
в) сем;
г) восем;
д) дзесяць.

***11. Выберыце радок са службовымі часцінамі мовы:***
*Варыянты адказу:*
а) злучнік, часціца, прыназоўнік;
б) назоўнік, злучнік, часціца;
в) злучнік, прыназоўнік, выклічнік;
г) прыслоўе, злучнік, часціца;
д) злучнік, часціца, дзеяслоў.

***12. Знайдзіце зменную часціну мовы:***
*Варыянты адказу:*
а) прыназоўнік;
б) прыслоўе;
в) займеннік;
г) часціца;
д) выклічнік.

***13. Словы, аднолькавыя па гучанні ці напісанні, але розныя па значэнні:***
*Варыянты адказу:*
а) сінонімы;
б) паронімы;
в) антонімы;
г) мнагазначныя;
д) амонімы.

***14. Сінонімы — гэта …***
*Варыянты адказу:*
а) словы, блізкія па значэнні;
б) словы, аднолькавыя па напісанні, але розныя па значэнні;
в) словы з супрацьлеглым значэннем;
г) словы, блізкія па напісанні, але розныя па значэнні;
д) словы, якія маюць некалькі значэнняў.

***15. Знайдзіце сярод прыведзеных слоў амонім:***
*Варыянты адказу:*
а) *інстынкт* — ‘прыроджаная здольнасць рабіць бессвядомыя мэтанакіраваныя дзеянні ў адказ на змены ўнутранага або знешняга асяроддзя’ і ‘ўнутранае чуццё’;

Репозиторий ГомГМУ

б) *капсула* — ‘абалонка для вадкіх або парашкападобных лякарстваў, якая прыгатаўляецца з крухмалу, жэлаціну і лёгка растварaецца ў арганізме’ і ‘тонкая абалонка або сумка, якая абвалаквае розныя органы, а таксама і паталагічныя ўтварэнні ў арганізме’;

в) *цік* — ‘міжвольныя скарачэнні мышцаў твару, шыі і рук як вынік захворванняў нервовай сістэмы’ і ‘шчыльная льняная або баваўняная тканіна, звычайна паласатая, якая ўжываецца для абіўкі мэблі і інш.’;

г) *морж* — ‘марская жывёла’ і ‘чалавек, які займаецца плаваннем зімой у адкрытых вадаёмах’

д) *імпарт* — ‘увоз у краіну замежных тавараў для рэалізацыі іх на ўнутраным рынку’ і ‘агульная колькасць або агульны кошт тавараў, якія дастаўляюцца ў якую-небудзь краіну з-за мяжы, а таксама сам гэты тавар’.

***16. Адзначце, што з пералічанага з'яўляецца асаблівасцю навуковага стылю:***

*Варыянты адказу:*

а) наяўнасць тэрмінаў;

б) канцылярскія штампы;

в) заклікі;

г) рытарычныя пытанні;

д) ацэначная лексіка.

***17. Адзначце, які стыль рэалізуецца ў аратарскіх выступленнях і СМІ:***

*Варыянты адказу:*

а) гутарковы;

б) публіцыстычны;

в) навуковы;

г) афіцыйна-дзелавы;

д) мастацкі.

***18. Выберыце сферу выкарыстання афіцыйна-дзелавога стылю:***

*Варыянты адказу:*

а) палітычная;

б) вытворчасці;

в) грамадска-палітычная;

г) бытавых зносін;

д) навукі.

***19. Адзначце, якая з наступных функцый мовы характэрна толькі для мастацкага стылю:***

*Варыянты адказу:*

а) камунікатыўная;



Репозиторий ГомГМУ

б) эматыўная;
в) пазнавальная;
г) эстэтычная;
д) рэгулятыўная.

***20. Лексікалогія — гэта …***
*Варыянты адказу:*
а) слоўнікавы склад мовы, сукупнасць значымых слоў;
б) раздзел мовазнаўства, які вывучае слоўнікавы склад мовы;
в) розныя словы для абазначэння аднаго і таго ж паняцця;
г) выкарыстанне моўных сродкаў у залежнасці ад і зместу выказвання;
д) правільны выбар слова і дарэчнасць яго прымянення.

***21. Слова ці словазлучэнне, створанае для дакладнага абазначэння спецыяльных паняццяў ці прадметаў, гэта …***
*Варыянты адказу:*
а) тэрмін;
б) прафесіяналізм;
в) жарганізм;
г) паронім;
д) афарызм.

***22. Адзначце слова, пры вымаўленні якога дапушчана памылка:***
*Варыянты адказу:*
а) [фудбол];
б) [дзв’эры];
в) [л’охка];
г) [кас’ц’аны];
д) [эгзам’эн].

***23. Адзначце словазлучэнне, у якім дапушчана памылка ў дапасаванні прыметніка да назоўніка:***
*Варыянты адказу*
а) абавязковы перапіс;
б) дарожны пыл;
в) барвовае лісце;
г) адчыненыя дзверы;
д) маленькі сланяня.

***24. Адзначце тлумачэнне, якое адпавядае фразеалагізму*** *быць на сёмым небе:*
*Варыянты адказу:*
а) уводзіць у зман, выхваляючыся сваімі здольнасцямі;
б) гаварыць пустое;



Репозиторий ГомГМУ

в) быць вельмі задаволеным, шчаслівым;
г) нечакана замоўкнуць;
д) зусім не турбавацца, не звяртаць ніякай увагі.

***25. Адзначце, у якім слоўніку змешчана інфармацыя пра нарматыўнае напісанне таго ці іншага слова:***
*Варыянты адказу:*
а) этымалагічны;
б) фразеалагічны;
в) перакладны;
г) арфаграфічны;
д) марфемны.

# ТЭМА 2
# АРФАГРАФІЧНЫЯ НОРМЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

## Тэст 1
### Правапіс галосных

***1. Адзначце правільна напісанае словазлучэнне:***
*Варыянты адказу:*
а) цёплы пулавер;
б) разбалованыя дзеці;
в) свежы твораг;
г) як снег на галаву;
д) кінуць з моста.

***2. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару ё:***
*Варыянты адказу:*
а) рады..хірург;
б) рады..часопіс;
в) рады..паглынальны;
г) рады..біялогія;
д) рады..тэрапія.

***3. Адзначце слова, у якім неабходна выбраць літару е:***
*Варыянты адказу*
а) барэль*(е,э)*ф;
б) б*(е,э)*к-вакаліст;
в) гелія*(е,э)*нергетыка;
г) тун*(е,э)*льны;
д) п*(е,э)*ндзаль.

Репозиторий ГомГМУ

***4. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару э:***
*Варыянты адказу:*
а) амерыканскі кангрэсм..н;
б) зімовая с..сія;
в) хуткасны інтэрн..т;
г) кансп..кт лекцый;
д) канс..рвавы завод.

***5. Адзначце радок, у якім ва ўсіх словах трэба ўставіць літару е:***
*Варыянты адказу:*
а) бен..фіс, п..рсік, губ..рнатар;
б) камплім..нт, палан..з, сп..ктакль;
в) каміз..лька, манум..нт, бізнесм..н;
г) эс.., эн..ргія, ін..ртны;
д) суперм..н, фрагм..нт, сурв..тка.

***6. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару а:***
*Варыянты адказу:*
а) два ж..тоны;
б) наш за..тэхнік;
в) новая др..зіна;
г) поўнасцю ас..нсаваць;
д) старая др..вотня.

***7. Адзначце слова, дзе трэба ўставіць літару э:***
*Варыянты адказу:*
а) банд..роль;
б) бр..зент;
в) аўтар..тэт;
г) адапт..р;
д) аранж..роўка.

***8. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару о:***
*Варыянты адказу:*
а) д..ўгавечны;
б) ст..гадовы;
в) ..рдэнаносец;
г) ільн..сеялка;
д) аўтам..тадром.

***9. Адзначце правільна напісанае слова:***
*Варыянты адказу:*
а) спартпляцоўка;

Репозиторий ГомГМУ

б) шэсцікласніца;
в) бамбасховішча;
г) мавазнаўчы;
д) высакаідэйны.

***10. Адзначце слова, у складзе якога лічэбнік напісаны з арфаграфічнай недакладнасцю:***
*Варыянты адказу:*
а) трохтысячны;
б) двухсотметровы;
в) чатырохтыднёвы;
г) восемсот;
д) соракапяцітонны.

***11. Адзначце слова з арфаграфічнай памылкай:***
*Варыянты адказу:*
а) рэкламадаўца;
б) фотаграфія;
в) сакратар-рэферэнт;
г) трохсотгоддзе;
д) фондасховішча.

***12. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару** о:*
*Варыянты адказу*
а) чырв..нагруды;
б) п..ўтысячы;
в) м..тацыкл;
г) сл..ваформа;
д) ф..таграфаваць.

***13. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару** э:*
*Варыянты адказу:*
а) ш..сцістольны;
б) аўтсайд..р;
в) панц..р;
г) поч..рк;
д) р..дкалессе.

***14. Знайдзіце слова, у якім пры змене націску не адбываецца чаргаванне** ро/ры:*
*Варыянты адказу:*
а) дровы;
б) роўнасць;
в) крошка;

Репозиторий ГомГМУ

г) скрогат;
д) бровы.

***15. Знайдзіце запазычанае слова, у якім трэба ўставіць літару** э:*
*Варыянты адказу:*
а) аранж..рэя;
б) д..лікатэс;
в) гангст..р;
г) лат..рэя;
д) д..легат.

***16. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару** я:*
*Варыянты адказу:*
а) роўн..дзь;
б) в..ранда;
в) рэкам..ндацыя;
г) с..местр;
д) ве..рападобны.

***17. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару** е:*
*Варыянты адказу:*
а) с..ржант;
б) дз..ржсакратар;
в) к..дроўнік;
г) с..рдэчны;
д) ..дловец.

***18. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару** ё:*
*Варыянты адказу:*
а) сво..часовы;
б) ..дзісты;
в) рады..вугляродны;
г) ц..плалюбівы;
д) рады..ізатоп.

***19. Знайдзіце памылкова напісанае слова:***
*Варыянты адказу:*
а) цёмнавалосы;
б) радыёэфір;
в) цеплаабмен;
г) жывёлагадоўля;
д) медаварэнне.



Репозиторий ГомГМУ

***20. Адзначце радок, у якім ва ўсіх словах трэба ўставіць літару*** *е:*
*Варыянты адказу:*
а) бо..зь, ..рэтык, зел..нь, пыл..сос, с..м’янін;
б) ув..рцюра, с..мсот, бег..мот, м..тафара, кал..ктыў;
в) купл..тыст, с..мнаццаць, ц..лежка, фл..йтыст, рады..тэхнічны;
г) маян..з, св..тлаваты, тыдз..нь, п..карня, дз..вятка;
д) шэсцьдз..сят, дыл..тант, п..даль, бал..рына, ..фрэйтар.

***21. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару*** *ы:*
*Варыянты адказу:*
а) звыш..мклівы;
б) супер..нтэлект;
в) дэз..нфекцыя;
г) між..нстытуцкі;
д) контр..гра.

***22. Знайдзіце няправільна напісанае слова:***
*Варыянты адказу:*
а) біёграф;
б) фіалка;
в) іанізацыя;
г) меліярацыя;
д) дыяметр.

***23. Адзначце слова, у якім трэба ўставіць літару*** *а:*
*Варыянты адказу:*
а) аві..цыя;
б) міні..цюра;
в) лі..на;
г) бі..графія;
д) фразе..логія.

***24. Адзначце слова, у якім на месцы пропуску трэба ўставіць літару*** *а:*
*Варыянты адказу:*
а) полі..ртрыт;
б) ды..тэз;
в) ды..фрагма;
г) стацы..нар;
д) мікрабі..логія.

***25. Адзначце радок, у якім усе словы напісаны правільна:***
*Варыянты адказу:*
а) геалогія, іон, трыа, матэрыал;
б) маёр, перыяд, сальфеджыа, варыянт;



Репозиторий ГомГМУ

в) кліент, раяль, абітурыэнт, кіяскёр;
г) ажыятаж, стадыён, канвеер, акцыанерны;
д) аксіёма, фейерверк, віяланчэль, чэмпіён.

***26. Адзначце слова, у якім на месцы пропуску трэба ўставіць літару я:***
*Варыянты адказу:*
а) ал..ргія;
б) в..нозны;
в) ап..тыт;
г) бюл..тэнь;
д) ан..мія.

***27. Знайдзіце няправільна напісаны лічэбнік:***
*Варыянты адказу:*
а) васямсот;
б) васямнаццаць;
в) дзевяцьсот;
г) семдзесят;
д) пяцьдзясят.

***28. Адзначце слова, у якім на месцы пропуску трэба ўставіць літару о:***
*Варыянты адказу:*
а) антыбі..тык;
б) скалі..з;
в) рацы..н;
г) альве..ла;
д) карды..лаг.

***29. Адзначце пару слоў, дзе беларускае напісанне адпавядае норме:***
*Варыянты адказу:*
а) Нью-Йорк — Нью-Ёрк;
б) Альбион — Альбіон;
в) Сантьяго — Сант’яго;
г) Иошкар-Ола — Яшкар-Ала;
д) Гайана — Гаіана.

***30. Знайдзіце сказ, у якім няма арфаграфічных памылак:***
*Варыянты адказу*
а) Лісіца, гарнастай, заяц-бяляк становяцца зімой зусім нявідзімкамі і бялізной свайго футра гатовы паспрачацца са снегам.
б) Дні паплылі над зямлёй светлыя, сонечныя, поўныя незлічоных пахаў травы і кветак.
в) Пачалося вясенняе паляванне на цяцерукоў.
г) У штаце Арызона ёсць вялікая катлавіна, утвораная ад падзення метэярыта, якое адбылося 25 тыс. гадоў назад.
д) Палярнікі ўбачылі на льдзіне белае мядзведзяня.



Репозиторий ГомГМУ

## Тэст 2
## Правапіс зычных

***1. Адзначце слова, у якім прапушчаны склад*** *ці:*

*Варыянты адказу:*

а) жэла..навы цэх;
б) з’едлівая са..ра;
в) шкарля..навая эпідэмія;
г) напружаны драма..зм;
д) знакаміты аль..ст.

***2. Адзначце слова, дзе трэба ўставіць склад*** *дзі:*

*Варыянты адказу*

а) *(ды,дзі)*пламатычная місія;
б) насмажыць *(ды,дзі)*чыны;
в) заслужаныя апла*(ды,дзі)*сменты;
г) працяглая *(ды,дзі)*скваліфікацыя;
д) старажытная тра*(ды,дзі)*цыя.

***3. Адзначце слова, дзе трэба выбраць склад*** *це:*

*Варыянты адказу:*

а) няспраўны *(тэ,це)*рмінал;
б) навуковы *(тэ,це)*рмін;
в) новая ап*(тэ,це)*ка;
г) *(тэ,це)*хнічны прагрэс;
д) зроблена ў *(Тэ,Це)*ляханах.

***4. Адзначце слова, у якім у беларускай мове з’яўляецца цеканне:***

*Варыянты адказу:*

а) билетёр;
б) византиец;
в) термометр;
г) сертификат;
д) астероид.

***5. Знайдзіце слова, у якім у беларускай мове няма дзекання:***

*Варыянты адказу:*

а) голландец;
б) пародия;
в) блондин;
г) командир;
д) каскадёр.



Репозиторий ГомГМУ

***6. Адзначце радок, у якім усе словы напісаны без памылак:***
*Варыянты адказу:*
а) гвардэец, пенальці, эпізодзік, манцёр;
б) балтыйскі, канфеці, авантура, тульпан;
в) верцікаль, жэлацін, дэманстрацыя, дэталь;
г) валанцёр, серпантын, антыквар, тэорыя;
д) тэхнічны, дысплей, індыец, арыенцір.

***7. Адзначце, у якім сказе ёсць памылкі ва ўжыванні правіл напісання*** *д/дз, т/ц:*
*Варыянты адказу:*
а) На лаве, ля самых дзвярэй, сядзеў чалавек у дзіравых ботах.
б) Экспедзіцыя накіравалася да берагоў ледзянога мацерыка.
в) Склад вайсковай амуніцыі называюць вайскоўцы капцёркай.
г) Дзеці з задавальненнем пілі чай, елі пасцілу і цукеркі.
д) Ватэрлінію дрэў на шашы перайшло лісцвяное разводдзе.

***8. Адзначце тэрмін, у якім у беларускай мове адбываецца пераход*** *д* ***у*** *дз*:
*Варыянты адказу:*
а) диатез;
б) диафрагма;
в) кардиология;
г) валокордин;
д) медицина.

***9. Адзначце тэрмін, у якім у беларускай мове адбываецца пераход*** *т* ***у*** *ц:*
*Варыянты адказу:*
а) панкреатит;
б) терапевт;
в) катетер;
г) термометр;
д) карантин.

***10. Адзначце суфікс, пры наяўнасці якога ў слове не адбываецца пераход*** *д/дз, т/ц:*
*Варыянты адказу:*
а) -ёр-;
б) -ейск-;
в) -ін-;
г) -ыст-;
д) -еец-.

***11. Адзначце слова, у якім прапушчана літара ў (у нескладовае):***

*Варыянты адказу:*

а) па..каводзец;

б) збожжа..борка;

в) рады..с;

г) шлагба..м;

д) а..л.

***12. Адзначце, у якім слове ў беларускай мове не адбываецца чаргаванне*** *л/ў****:***

*Варыянты адказу:*

а) полметра;

б) волк;

в) смолкли;

г) щёлкать;

д) скандал.

***13. Знайдзіце слова, у якім трэба ўставіць*** *у (у складовае)****:***

*Варыянты адказу*

а) фра..;

б) мане..р;

в) дваяка..вагнуты;

г) кантрольна-..ліковы;

д) дыназа..р.

***14. Адзначце слова, у якім на месцы пропуску трэба ўставіць*** *ў (у нескладовае)****:***

*Варыянты адказу:*

а) а..таномія;

б) аквары..м;

в) шо..;

г) стра..с;

д) прэзіды..м.

***15. Адзначце слова, у якім на месцы пропуску трэба ўставіць*** *у (у складовае)****:***

*Варыянты адказу:*

а) ра..нд;

б) нака..т;

в) ва ..ніверсітэце;

г) а..дыторыя;

д) кансілі..м.

Репозиторий ГомГМУ

***16.*** ***Адзначце, у якім сказе на месцы пропускаў трэба ўсюды ўставіць*** *ў (у нескладовае)**:***

*Варыянты адказу:*

а) Наш Іван не ба..ван: што пайма.., тое .. карман.

б) Багдановіч чамусьці, ..зяўшы свой ба..льчык, выйша.. з вагона.

в) Брыгада стаяла .. лясах .. рады..се кіламетраў дваццаці.

г) Цягнік стая.. перад апушчаным шлагба..мам.

д) На “..сушку” ..се зладзеі ..складаюць шмат надзеі.

***17.*** ***Знайдзіце канструкцыю, у якой дапушчана арфаграфічная памылка:***

*Варыянты адказу:*

а) беларуска-украінскі слоўнік;

б) прададзены на аўкцыёне;

в) ад родных ніў, ад роднай хаты;

г) адсвяткавалі медыум;

д) дзяржаўная унія.

***18. Адзначце слова, напісанае правільна:***

*Варыянты адказу*

а) нацыянальны *рэзерў;*

б) слановыя *біўні;*

в) фінская *сауна;*

г) блішчасты *соўснік;*

д) смачны *біўштэкс.*

***19. Адзначце радок, у якім трэба ўставіць аднолькавую літару:***

*Варыянты адказу*

а) прыгожыя ..ланы, хлопчык-..мелец, юбілейная ..ніверсіяда;

б) а..рыканскі поні, філосо..скі трактат, а..мазны фонд;

в) ска..цкі рух, біць у літа..ры, ко..ка сталі;

г) поўная ..рна, цікавае авіяшо.., бікфорда.. шнур;

д) на ..ральскіх дарогах, а..гіевы стайні, насілі ..нты.

***20. Адзначце словазлучэнне, дзе прапушчана прыстаўная літара*** *в:*

*Варыянты адказу*

а) _окамгненная ўспышка;

б) невялічкі _узгорак;

в) _азёрны край;

г) веласіпедныя _абады;

д) лёгкая _аблачынка.

***21.*** ***Знайдзіце слова, у якім у беларускай мове прыстаўная*** *в* ***не патрэбна:***

*Варыянты адказу:*

а) осьминог;



Репозиторий ГомГМУ

б) опыт;
в) урна;
г) околица;
д) устрица.

***22. Адзначце, у якім слове ў беларускай мове пішуцца падоўжаныя зычныя:***
*Варыянты адказу:*
а) грипп;
б) касса;
в) тонзиллит;
г) коллектив;
д) донна.

***23. Знайдзіце слова, напісанае няправільна:***
*Варыянты адказу:*
а) піца;
б) алея;
в) эскадрылья;
г) Юльяна;
д) мецца-сапрана.

***24. Адзначце неславянскае слова, дзе прапушчана літара:***
*Варыянты адказу:*
а) *постаталітарны* перыяд;
б) якасная *пластмаса;*
в) вопытны *папарацы;*
г) стаяць на *пероне;*
д) дзве *тоны*.

***25. Адзначце слова з падвоеным напісаннем літар:***
*Варыянты адказу:*
а) амшан*(н,нн)*ік;
б) чу*(л,лл)*івы;
в) вялікамуча*(н,нн)*ік;
г) ю*(н,нн)*ы;
д) пале*(с,сс)*кі.

***26. Адзначце радок, дзе ва ўсіх словах мяккі знак не пішацца:***
*Варыянты адказу:*
а) ледз..ве, мядз..ведзь, аген..чык;

Репозиторий ГомГМУ

б) пяц..сот, п..еса, будз..ма;

в) памнож..це, сардэл..ка, с..вятло;

г) балон..чык, калос..се, кан..ён;

д) сем.., подз..віг, завез..ці.

***27. Адзначце словазлучэнне, дзе прапушчаны два мяккія знакі:***

*Варыянты адказу*

а) нацыянал..ныя мен..шасці;

б) дзевяц..сот трыл..ёнаў;

в) грыз..ці кос..ці;

г) раз..юшаны суб..ект;

д) разан..скі сем..янін.

***28. Знайдзіце слова, у якім на месцы пропуску не трэба ставіць мяккі знак:***

*Варыянты адказу:*

а) паштал..ён;

б) парц..еры;

в) нал..еш;

г) бул..ён;

д) дас..е.

***29. Адзначце слова, дзе на месцы пропуску апостраф не пішацца:***

*Варыянты адказу:*

а) двух..ярусны;

б) здароў..е;

в) круп..е;

г) суб..ядзерны;

д) інтэрв..ю.

***30. Знайдзіце сказ, у якім няма арфаграфічных памылак:***

*Варыянты адказу:*

а) Поезд імчаў вельмі шпарка, мінуўшы апошні разьезд перад Пінскам.

б) Заішоўшы ў векавыя нетры, стаю, зачараваны ім, на паўміл’ярдным кіламетры, паміж наступным і былым.

